This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Instytut Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2025.pp.333-337

Przegląd Środkowo-Wschodni, 10, 2025
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20251015

Data przesłania:
Data akceptacji:

**Aliona Liubaya**
Uniwersytet Warszawski
a.liubaya@uw.edu.pl
ORCID: 0000-0001-9051-4539

# Гарадскія могілкі як канструяванне тэкстаў калектыўнай памяці горада Мінска ў другой паловы XIX – апошняй трэці XX ст.

*Вайсковыя могілкі ў Мінску: зберагаючы памяць*, укл.: Юрый Тамковіч, Павел Каралёў, Мінск: Р.М. Цымбераў, 2025. – 388 с.

Вайсковыя могілкі горада Мінска знаходзяцца ў самым сэрцы сталіцы Беларусі і з’яўляюцца адлюстраваннем і сведкам бурлівых падзей гісторыі горада і краіны ад другой паловы XIX ст. да сёння. Мемарыяльны комплекс закладаўся як новыя могілкі губернскага горада, для падобных мэтаў была арэндавана зямля ў Эдварда Вайніловіча. Першапачаткова тут пачалі хаваць афіцэраў і салдат расійскай арміі, якія праходзілі лячэнне ў 1860-1880-х гг., але таксама і ўраднікаў Расійскай імперыі. А з часам могілкі становяцца месцам пахавання мінскіх цывільных гараджан, інтэлігенцыі, царкоўнікаў – розных гарадскіх эліт. У XX ст. Вайсковыя могілкі трансфармуюцца ў месца пахавання дзеячаў рэвалюцыйнага руху, народжанай беларускай дзяржаўнасці, адначавова становяцца месцам пахавання творчай інтэлігенцыі, універсітэцкай прафесуры, нават удзельнікаў антысавецкага беларускага руху, а таксама ахвяраў ваенных падзей 1941–1944 гг. У другой палове

XX ст. савецкая творчая інтэлігенцыя бачыць Вайсковыя могілкі як патэнцыяльнае месца мемарыялізацыі беларускай культуры – тут былі пахаваны абодва беларускіх класіка літаратуры Якуб Колас, а ў 1962 г. сюды ж перамяшчюць з Масквы ўрну з астанкамі Янкі Купалы (надмагіллі будуць ўзведзены толькі ў 1970–1971 гг.). Што беумоўна закладала патэнцыял стварэння Пантэону дзеячоў беларускай культуры  (прынамсі яе сацыялістычнага перыяду). У 1980–1990-ыя гг. з'яўляецца традыцыя чытаць вершы ля помнікаў класікаў беларускімі літаратарамі.

Агульнавядомыя ці прыватныя факты з функцыянаванні падобных тэкстаў памяці, звязаныя з Вайсковымі могілкамі, складалі хутчэй гарадское паданне, чым частку грунтоўнага кампендуўму ведаў. Аднак, гэта характэрна і для іншых некропаляў горада Мінска. Выключэннем магчыма з'яўляюцца Кальварыйскія могілкі (самыя старыя з функцыянуючых у сталіцы Беларусі) ці Усходнія могілкі (як месца спачыну палітычных дзеячаў Беларусі другой паловы XX, і творчай інтэлігенцыі ад познесавецкага часу да сёння).

Таму, прадстаўленая на рэцэнзію манаграфія беларускіх гісторыкаў і краяведаў Юрыя Тамковіча і Паўла Каралёва, звятрае на сябе ўвагу як адзін з першых прыкладаў комплекснага агляду асобна вылучанага некропаля горада Мінска.

Аўтары дэкларуюць актуальнасць з'яўлення такога твора сёння патрэбамі фіксацыі структуры і мастацкай спадчыны гарадскіх могілак на рубяжы трох эпох: познеімперскай, савецкай і сучаснай беларускай. Акрамя фарміравання і эвалюцыі сваёў "ідэалогіі" і канцэпцыі памяці на гарадскіх могілак ва ўсіх трох эпохах, Вайсковыя могілкі маюць і мастацкую вартасць у надмагіллях, аздабленні агароджы, фармравання "рытуалаў" і "гісторый" вакол асобных месцаў на прасторы некропаля. У 2018 г. абвяшчаецца дзяржаўная праграма ўпарадкавання могілак, выкліканая іх станам і эстэтычным выглядам (фактычна недагледжанасцю), якая спарадзіла ў мінскіх краяведаў занепакоенасць перад стратай і ланшафту могілак, і шэрагу аб'ектаў.

Манаграфія “Вайсковыя могілкі ў Мінску: зберагаючы памяць” выйшла ў 2025 г. у выдавецтве Рамана Цымберава і з’яўляецца прыватнай ініцыятывай мінскіх гісторыкаў Юрыя Тамковіча і Паўла Каралёва. Праект стварэння манаграфіі абагульняе дзейнасць цэлай групы валанцёраў, якія на працягу шэрагу гадоў дапамагалі ўпарадкоўваць і інвентарызаваць пахаванні на Вайсковых могілках. Вынікам дзейнасці сталі апублікаваныя дадаткі да манаграфіі (спісы і візуальны матэрыял), якія на сёнешні момант з’яўляюцца ўнікальнымі крыніцамі і адначасова фіксацыяй пахаванняў па стане на першую чвэрць XXI ст.

Структура манаграфіі выконвае падвоеную мэту, закладзеную аўтарамі. З аднаго боку складаецца з аналітычнага матэрыялу па гісторыі некропаля, утрымлівае біяграмы ідэнтыфікаваных асобаў, якія спачываюць на Вайсковых могілках. З іншага боку, манаграфія ўтрымлівае даследаванне мемарыяльнай культуры на прыкладзе аздаблення пахаванняў (надмагілле, агароджы) і выкарыстанне асобных пахаванняў у грамадскіх мерапрыемствах канструявання культуры памяці сваёй эпохі (палітычных, культурных і інш. – напрыклад надмагілле Паўлюка Труса ці Янкі Купалы). Манаграфія ўтрымлівае каляровыя фатаздымкі аб’ектаў, а таксама мае тэхнічны навуковы апарат – імянны паказальнік.

Манаграфія складаецца з шасці частак, кожная з якіх мае сваю ўнутраную лагічную структуру і раскрывае адзін з аспектаў праблемы. Ва ўводзінах аўтары раскрываюць актуальнасць правядзенне даследчых і палявых работ па гісторыі некропаля і фіксацыі стану могілак да і пасля правядзення работ па іх ўпарадкаванню.

У частцы “Гістарыяграфія” гісторыкам Ю. Тамковічам былі абагульнены асноўныя даследаванні па некрапалістыцы ў рэгіёне Усходняй Еўропы ў XX ст., адзначаны стан навуковай дысцыпліны ў Беларусі на сучасным этапе. Глава дае магчымасць ацаніць перспектывы дадзенага накірунку даследаванняў у Беларусі, параўноўваючы яго з працамі і патэнцыялам выкарыстання крыніц, напрыклад, у польскіх ці расійскіх спецыялістаў. Безумоўна, упер-

шыню была абагульнена інфармацыя па даследаванню саміх Вайсковых могілак, што дазволіла аўтару вызначыць перспектыўныя пытанні, якія будуць раскрыты ў трэцяй частцы.

Уласна трэцяя частка манаграфіі "Гісторыя Вайсковых могілак", якая з'яўляецца аналітычным ядром работы, падзяляецца на падглавы і вызначае асобныя пяць перыядаў у развіцці мінскага некропаля. Гэта – "дарэвалюцыйны перыяд", "міжваенная эпоха", "ваенны перыяд", "пасляваенны перыяд" і час "пасля закрыцця могілак". Асноўны аналітычны матэрыял – уласна пахаванні і асобы. Аднак у аналізу міжваеннай эпохі – 1920-1930-ыя гг. – Юрый Тамковіч імкнецца раскрыць не толькі павелічэнне колькасці пахаванняў, але і спецыфіку функцыянавання могілак. А менавіта стварэнне і перарабленне (выкарыстанне другі раз) надмагілляў. Для гэтага аўтарам была праведзена тыпалагізацыя наяўнага матэрыялу (архіўныя матэрыялы, фота-кінадакументы, публіцыстыка, успаміны і інш.), праведзены аналіз прадукцыі арцеляў і аўтараў надмагілляў першай паловы XX ст., якія працавалі ці ўплывалі на дадзены рэгіён. У тэксце аўтар раскрывае механізмы знікнення памяці пра асобныя пахаванні, зацікаўленасць такіх структур як праваслаўная царква, беларускія і замежныя культурніцкія таварыствы (напрыклад Расійскай Федэрацыі) у маркіроўцы прыстутнасці сваёй культуры на цэнтральным мінскім некропалі ў XXI ст. Праз з'яўленне новых помнікаў, рэстаўрацыю і абнаўленне былых надмагілляў, праз змену эстэтыкі і ідэйнага насычэння ў надпісах і сімволіцы.

Асобна варта вылучыць дапаможны матэрыял манаграфіі – Дадаткі і Матэрыялы інвентарызацыі Вайсковых могілак. У дадатках аўтары раскрываюць такія аспекты прасторы як праблема збережэння некропаля (план рэстаўрацыі прадугледжвае ў тым ліку і замену рознаэпохавых помнікаў уніфікаванымі надмагіллямі), напісанне надмагілляў і агароджаў як мастацкіх ці эстэтычных аб'ектаў (улічваецца паходжанне надмагілляў і агароджы, іх пераробка з аб'ектаў гарадской архітэктуры), і нават прырода Вайсковых могілак (аўтары А. Спіцын і Т. Кудзеліна). Асобна варта вылучыць

даследаванне Ю. Тамковіча па пахаванням на Вайсковых могілках выкладчыкаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. А таксама аналіз пахаванняў на Вайсковых могілках памерлых вайскоўцаў з асабістага складу Каломенскага і Серпухаўскага палкоў.

Уласна інвентар Вайсковых могілак (чатыры сектара) ахоплівае магчымыя да ідэнтыфікацыі надмагіллі некропаля. Як пішуць самі аўтары, у тлумачэнні да сваёй місіі пры інвентарызацыі: "На жаль, людская памяць даволі кароткая, а надмагільны помнік не заўжды з'яўляецца надзейным сродкам яе захавання. Таму мы спадзяёмся, што гэты спіс дазволіць не страціць інфармацыю пра нябожчыкаў у доўгатэрміновай перспектыве". Як і апісанне надмагілляў гэты інвентар пахаванняў разгладаецца аўтарамі як "корпус тэкстаў інскрыпцый" – ўласны, самастойны матэрыял для вывучэння гісторыі некропаля і, адначасова, тыпаў канструявання калектыўнай памяці.

З'яўленне падобных комплексных даследаванняў чакалася ў беларускай гістарычнай навуцы з канца XX ст. і насёння адлюстроўвае складаны працэс па ўпісанню гарадскіх некропаляў у праблемнае поле гісторыі памяці, як самастойнай дысцыпліны, і культуры памяці, калі мы кажам пра развіццё нацыянальнай самасвядомасці. Прыклад дадзенага выдання паказвае нам, што правядзенне даследавання асобных некропаляў магчыма, але патрабуе акамуляванне патэнцыялу прафесійных гісторыкаў, краяведаў-валанцёраў, неабходнасць разглядаць не толькі фактаграфію, але і культурна-эстэтычныя і ідэалагічныя аспекты. Дадзеная манаграфія вельмі ўдалы пачатак на падобныя даследаванні для беларускай некрапалістыкі ў XXI ст.